Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 98 (28714)

25 МАЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА



**Новабудоўля ці другасны рынак?**

СТАР. 7



**Папярэдзіць траўматызм на працы**

МС



**Сакрэты «Нацыянальнага хіт-парада»**

СТАР. 13

# У МІНСКУ ГАВОРАЦЬ ПРА МІР

## Прэзідэнт узяў удзел у міжнародным форуме экспертнай ініцыятывы «Мінскі дыялог»



**Сёлета ён атрымаў назву «Усходняя Еўропа: у пошуках бяспекі для ўсіх». У цяперашнім форуме бяруць удзел 350 экспертаў і афіцыйных асоб больш чым з 40 краін. Другі дзень маштабнага дыялогу адкрыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

### ЗНАЧНАСЦЬ ПЛЯЦОЎКІ ЎЗРАСТАЕ

У пачатку свайго выступлення кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сама назва канферэнцыі сведчыць аб тым, што вынесеныя на разгляд удзельнікаў пытанні прадыктаваныя часам і актуальныя для многіх дзяржаў.

«Невыпадкова гэта мерапрыемства праходзіць у Мінску. Тут ужо традыцыйна прадстаўнікі розных краін і рэгіёнаў планеты могуць у абсалютна спакойнай абстаноўцы, поўнай бяспецы абмяркоўваць абсалютна любыя, нават самыя вострыя пытанні, — падкрэсліў ён. — Дзякуючы шматвектарнай знешняй палітыцы Беларусі, павазе да замежных партнёраў, устойліваму сацыяльна-эканамічнаму развіццю нашай дзяржавы ўзрастае яе значнасць як зручнай пляцоўкі, зручнага месца для любых перагавораў».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што на канферэнцыі прысутнічаюць эксперты, навукоўцы і прадстаўнікі краін Заходняй і Усходняй Еўропы, Расіі, ЗША і Кітая, што пацвярджае глабальнасць разглядаемых праблем.

Беларускі лідар дадаў, што Мінская экспертная пляцоўка закліканая спрыяць абмену думкамі, аргументаванай дыскусіі і пачатку дыялогу, дэфіцыт якога выразна адчуваецца ў цяперашніх міжнародных адносінах. На яго думку, важна выпрацаваць і прадстаўіць палітыкам акрэсленыя прапановы, як зрабіць гэта з захаваннем інтарэсаў усіх бакоў.



Фота БелТА.

«Для многіх людзей відавочна, што з моманту заканчэння халоднай вайны еўрапейская архітэктура бяспекі яшчэ не перажывала такога глыбокага сістэмнага крызісу», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### НІЯКІХ ГАРАНТЫЙ, ШТО ЎСЁ НЕ ПАЎТОРЫЦЦА

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што важнасць існуючых сусветных праблем разумеюць і парламентарыі розных краін. «Менш за год таму на адкрыцці сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ тут жа, у Мінску, адбыўся шырокі абмен думкамі па гэтай тэматыцы, — нагадаў Прэзідэнт. — Тады Беларусь унесла ініцыятыву аб неабходнасці пачатку новага маштабнага міжнароднага дыялогу па пытаннях бяспекі. Ён павінен быць накіраваны на пераадоленне існуючых супярэчнасцей ва ўзаемаадносінах дзяржаў на агульнай прасторы Еўраатлантыкі і Еўразіі».

Паводле яго слоў, важна, каб такі дыялог пачаўся і яго вынікам стала рэальнае ўмацаванне міжнароднай бяспекі, паколькі апошнія канфлікты толькі пацвярджаюць горшыя меркаванні наконт развіцця сітуацыі ў свеце. «Вялікія дзяржавы, якім належыць быць надзейнымі гарантамі стабільнасці, сёння не могуць прыйсці да адзінага меркавання ні па адным з сур'ёзных пытанняў», — дадаў ён.

Беларускі лідар падкрэсліў, што неспакой, перш за ўсё, выклікае адсутнасць гарантый недапушчэння маштабнага ўзброенага канфлікту, бо сёння трэць дзяржаў планеты ўцягнутыя ў баявыя дзеянні. Па вялікім рахунку, гэта перавышае колькасць краін — удзельніц Другой сусветнай вайны, таму нельга чакаць, пакуль шугане пажар трэцяй.

На думку Прэзідэнта, буйным геапалітычным гульцам час задумацца аб стане сучасных міжнародных адносін, якія вельмі нагадваюць сітуацыю перад Першай сусветнай вайной.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ва ўмовах цяперашніх глабальных геапалітычных і эканамічных трансфармацый прынцыповыя супярэчнасці паміж дзяржавамі назапашваюцца і прымаюць вострую форму, а на авансцэну зноў выходзіць стратэгічнае саперніцтва, канкурэнцыя паміж вядучымі краінамі.

Адбываецца прамое і ўскоснае парушэнне міжнароднага права, грэбаванне ім становіцца жахлівай практыкай, якая апраўдваецца аналагічнымі дзеяннямі апанентаў.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел САПОЦЬКА, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея:**

*«Прыйшоўшы ў Нацыянальны гістарычны музей у ролі кіраўніка, я быў вельмі здзіўлены, якім велізарным багаццем валодае музей і якая колькасць узрушальных, унікальных экспанатаў ёсць у запасніках. У Нацыянальным гістарычным захоўваецца больш як 50 % усяго аб'ёму музейнага фонду — каля 450 тысяч адзінак захоўвання. Усё трэба максімальна паказваць за кошт часовых выставак, сумесных міжнародных праектаў, а для гэтага — шырока выкарыстоўваць патэнцыял супрацоўніцтва падчас праграм абмену, дзён культуры. Патрэбна шматгранная, шматаспектная праца. Усё гэта павінна быць вядома шырокім слаям насельніцтва, гэта трэба беларусам, нам ёсць чым ганарыцца».*

## ■ Класныя навіны

**Рэспубліканскае свята «Апошні званок» упершыню пройдзе 30 мая ў шматфункцыянальным культурна-спартыўным комплексе «Мінск-Арэна». Яго ўдзельнікамі стануць выпускнікі сталічных школ плюс больш за тысячу выпускнікоў з рэгіёнаў Беларусі — па сто найлепшых прадстаўнікоў з пяці абласцей і каля 600 выпускнікоў з Мінскай вобласці.**

# Сустрэча світання не забараняецца

## Выпускныя вечары адшумяць 9 і 10 чэрвеня

Як паведаміла журналістам **кансультант галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК,** планецуца, што гэта свята стане традыцыйным. Запрашэнне на яго атрымалі кіраўнікі горада, міністэрстваў, дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, выбітныя спартсмены, удзельніцы конкурсу «Міс Беларусь — 2018» і іншыя. Святочныя мерапрыемствы распачнуцца на прылеглай да «Мінск—Арэны» тэрыторыі ў 16 гадзін. Там пройдзе культурна-забаўляльная праграма «Парк маладзёжных культур». Праграма ўключае выступленні творчых калектываў, забаўляльныя гульні, спартыўныя спаборніцтвы, навучанне танцам. Будуць працаваць таксама фотазоны. А ў 18 гадзін распачнецца само свята. Падчас урачыстай часткі найлепшых выпускнікоў — пераможцаў міжнародных алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў, творчых конкурсаў — узнагародзяць каштоўнымі прызамі і памятнымі знакамі. Будуць вызначаны пераможцы ў намінацыях «Талент», «Чэмпіён-2018», «Самы класны класны». У апошняй узнагародзяць найлепшых класных кіраўнікоў, якія перамаглі ў сваіх абласцях і ў сталіцы.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, афарміўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!